# РАІСА БАРАВІКОВА: "КНІГА – ЯК СВЯТЛО Ў АКНЕ…"

◆ *"Мой дом там, дзе мая бібліятэка", – казаў Эразм Ратэрдамскі. Ці блізкае Вам гэтае выказванне?*

Безумоўна, блізкае, але асабіста для сябе я яго трошкі зыначыла б. Для мяне яно гучыць так: "Мая бібліятэка там, дзе мой дом".

Я амаль усё жыццё (як і большасць пісьменнікаў) збірала кнігі. Купляла творы аўтараў, якія найбольш цікавілі, былі блізкімі: і класікаў, і сучаснікаў. У маёй бібліятэцы мала выпадковых кніг, але тыя, што ёсць – не ведаю, ці ўдасца ўсе прачытаць да канца жыцця. Апошнія гады шмат перачытваю. Адсюль выснова: добрыя кнігі, у адрозненне ад людзей, не старэюць. Для іх не існуе ўзросту.

А што да выказванняў… У кагосьці з літаратуразнаўцаў прачытала, што Аляксандр Македонскі, калі захапіў са сваімі воямі старажытныя Фівы, сказаў: "Можаце знішчыць і разбурыць усё, толькі не чапайце Дом паэта"… Мяркую, ён меў на ўвазе не жытло нейкага пэўнага творцы, а Дом кнігі – своеасаблівы тагачасны культуралагічна-асветніцкі цэнтр, дзе Паэзія займала самае высокае месца, была падмуркам філасофска-мастацкага слова. Разам з тым той Дом паэта быў і сховішчам кніг, іншымі словамі – бібліятэкай, найвялікшым скарбам, таму што на старонках тых кніг хаваліся разнастайныя веды. Аляксандр Македонскі быў не толькі славутым палкаводцам, але яшчэ і вялікім кніжнікам. Меў і вялікую ўласную бібліятэку, якую, на жаль, да сёння не могуць знайсці. А колькі таямніц глыбокай старажытнасці раскрылася б нам праз тыя кнігі! Праз іх мы маглі б больш даznaцца пра цывілізацыі, якія існавалі да нашай, і атрымаць адказы на многія актуальныя пытанні. Найперш: што прыводзіла старажытныя культуры да поўнага знікнення і што дапамагала, калі жыццё на Зямлі зноў і зноў пачыналася з першабытнага чалавека.

◆ *Першая ў жыцці кніга; любімыя аўтары ў дзяцінстве, маладосці і цяпер; яркі ўспамін, звязаны з кнігай; творы, да якіх час ад часу хочацца вярнуцца.*

"Кніга не толькі вучыць, яна яшчэ шмат што падказвае, і нярэдка захапляе сваёй казачнасцю, і зачароўвае, як святло ў акне. Чым больш чытаеш, тым болей ведаеш", – прыблізна так казала мне ў ранні дзяцінстве мама, і хацелася як мага хутчэй навучыцца чытаць… Ужо ў першым класе я адкрыла для сябе школьную бібліятэку. На пачатку 50-х гадоў мінулага стагоддзя дзіцячых кніжак у ёй было няшмат. Іх хутка разбіралі вучні, і даводзілася запісвацца ў чаргу. Я любіла народныя казкі і апавяданні пра жывёл, пра прыроду. А ў старэйшых класах, калі ўжо сама пачала пісаць вершы, захаплялася паэзіяй. З сёмага класа наведвала раённую бібліятэку. А ў Літаратурным інстытуце…

Хочацца згадаць адзін з першых экзаменаў, дзе сярод пэўных літаратурных тэм была і вольная тэма. І вось расселіся, кожны выбраў, пра што пісаць, і тут мяне кранўў за плячо мой будучы аднакурснік, зашаптаўшы на вуха: "Вы не памятаеце, як правільна пішацца *Экзюпеы* ці *Экзепюры*?" (ён пісаў вольнае сачыненне). Я на момант задумалася і адказала: "Не, не памятаю" – і тут жа пачырванела, бо ўпершыню пачула гэтае прозвішча, маўляў, а яшчэ ў Літаратурны інстытут паступаю! Адразу пасля экзамену пабегла ў багатую інстытуцкую бібліятэку: "Мне, калі ласка, Экзюперы", – выпадкова вымавіла правільна. І ўжо калі атрымала кнігу класіка французскай літаратуры, прачытала на вокладцы поўнае: "Антуан дэ Сент-Экзюперы"… Так з бібліятэкі пачалося маё літінстытутаўскае навучанне. А "Маленькага прынца" не-не і цяпер перачытваю. Асабліва калі вельмі самотна і хочацца, каб кранула душу штосьці пяшчотнае, чыстае-чыстае, наіўнае на ўзроўні геніяльнасці…

◆ *Любімае выслоўе, дэвіз.*

У студэнцкія гады я, безумоўна, дыхала Паэзіяй. Тым часам у Маскве яшчэ жыла наша надзвычай знакамітая паэтка Канстанцыя Антонаўна Буйло – аўтар класічнага верша "Люблю", які стаў народнай песняй. Помню, падчас нашай першай сустрэчы на Ціхвінскім завулку, дзе яшчэ да вайны некалькі разоў яе госцем быў Янка Купала, Канстанцыя Антонаўна мне казала: "Ведаеце, як я вызначаю, сапраўдны паэт ці не? Па дрыжыках… Вось слухаю вершы, і ў нейкі момант на нейкім радку дрыжыкі бягуць па скуры… Адразу ж хочацца крыкнуць: Паэт! Вялікі паэт!" З таго часу на паэтычных вечарах я таксама заўжды чакаю дрыжыкаў на скуры… І нярэдка адчуваю – і ганаруся, што ў нас надзвычайная, выдатная Паэзія! У ранейшыя часы Беларусь называлі Краінай паэтаў. І многія радкі самых розных аўтараў на ўсё жыццё застаюцца запамінальнымі, робяцца трапнымі выслоўямі. Я з ранняй маладосці памятаю радкі Аляксея Пысіна, аднаго з маіх літаратурных настаўнікаў, паэта-франтавіка: "Ведайце, калі мяне не стане, я ў сваю дывізію пайшоў!" А ў хвіліны расчараванняў міжволі згадваю іншага класіка, Аляксандра Пушкіна: "Обмануть меня не трудно, я сам обманываться рад". Нехта

# І МУДРАСЦІ, І ВЕДАЎ ХРАМ

## ДА 100-ГОДДЗЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ



**Стваральнікі "Маладняка" Язэп Пушча, Уладзімір Дубоўка, Андрэй Александровіч.**
1924 або 1925 г. *З фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.*



**Літаратурнае аб'яднанне "Маладняк".** Сядзяць: **Язэп Падабед, Алесь Якімовіч, Міхась Чарот, Алесь Дудар, Язэп Пушча.** Стаяць: **Адам Бабарэка, Нічыпар Чарнушэвіч, Паўлюк Трус, Анатоль Вольны, Андрэй Александровіч, Кузьма Чорны.**
1924 або 1925 г. *З фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.*

# І МУДРАСЦІ, І ВЕДАЎ ХРАМ

ДА 100-ГОДДЗЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ



**Удзельнікі пленума Цэнтральнага бюро Усебеларускага аб'яднання пісьменнікаў "Маладняк".** Мінск, 21–23 сакавіка 1925 г.



**"Маладняк".** У першым шэрагу: **Нічыпар Чарнушэвіч, Адам Бабарэка, Анатоль Вольны, Язэп Пушча, Андрэй Александровіч;** у другім шэрагу: **Алесь Гурло, Міхась Зарэцкі.** Мінск, 1925 або 1926 г. *З фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.*



*Раіса Андрэеўна Баравікова (нар. 11 мая 1947 г. у в. Пешкі Бярозаўскага раёна) – пісьменніца, перакладчыца. Скончыла аддзяленне мастацкага перакладу Літаратурнага інстытута ў Маскве. Працавала літсупрацоўніцай у Быхаўскай раённай газеце "Маяк Прыдняпроўя", рэдактарам на кінастудыі "Беларусьфільм", у газетах "Літаратура і мастацтва", "Чырвоная змена", узначальвала часопісы "Алеся", "Маладосць". Член Саюза пісьменнікаў СССР (з 1977 г.). Лаўрэатка Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова Саюза пісьменнікаў Беларусі (1988) за кнігу лірыкі "Каханне", Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1994) за кнігу паэзіі "Люстэрка для самотнай".*

з прыхільнікаў маёй паэзіі можа і ў мяне знайсці радкі, якія лёгка запомніць. Ну, скажам: "Нас маладосць адорвае каханнем, каханне нас вяртае ў маладосць" альбо: "Тады ў народа ёсць паэты, калі ў паэтаў ёсць народ"…

◆ *Літаратары або гістарычныя асобы, якія найбольш паўплывалі, чый прыклад жыцця захапляе.*

У розныя часы жыцця я пісала пра творчасць многіх нашых паэтаў: і пра журботную, натхнёна-лірычную Жэню Янішчыц, і пра народнага паэта Ніла Сымонавіча Гілевіча, і пра заўжды загадкавага Леаніда Дранько-Майсюка… А яшчэ пра многіх хочацца напісаць, напрыклад пра філасофска-лірычную паэзію Алеся Бадака, з якім не адзін год працавала ў часопісе "Маладосць", пра "Пані Шыпшыну" Людмілы Рублеўскай, пра непераўзыдзеныя балады Віктара Шніпа, пра шчымліва-дзёрзкую "Сарматыю" Марыі Мартысевіч…

Так, Сарматыя… Сарматы… Яны сталі маёй вялікай цікавасцю і нават такімі-сякімі доследамі, якія агучваю нейкім бокам у аповесці, што ўсё ніяк не магу давесці да ладу, "Фальварак каменнай бабы". Праўда, найбольшае месца ў творы займае славутая гістарычная асоба, наш вялікі мастак, кампазітар, музыкант і нават паэт (у яго, на жаль, вядомы толькі адзін верш) Напалеон Орда.

Дарэчы, у аповесці, якую я згадала, можна сказаць, галоўная гераіня – бібліятэкарка, дакладней, загадчыца бібліятэкі ў мінулым.

◆ *Беларуская кніга – універсум нацыянальнай культуры…*

Здаўна існуе повязь: *пісьменнік – кніга – бібліятэка – чытач.* І тут, безумоўна, вялікую культурна-асветніцкую ролю адыгрывае не толькі кніга, а бібліятэкар. Я заўжды радуюся тэлефонным званкам ад іх і захапляюся іхняй адданасцю кнізе, любоўю да роднага слова. Бібліятэка – гэта ж не проста сховішча кніг. З яе, асабліва для маленькага чытача, пачынаецца шлях да Бацькаўшчыны, да гістарычнага мінулага і сучаснасці.

◆ *Выбіраючы паміж мінулым, сённяшнім днём і будучым, які час абралі б для жыцця?*

У нізцы вершаў "Да графічных малюнкаў Напалеона Орды" ў мяне ёсць радкі: "Чаму не нарадзілася ў стагоддзі тым самым, што было калісь тваім?" З такім пытаннем я, напэўна, магла б звярнуцца і да Барбары Радзівіл, калі пісала гістарычную драму пра яе. Але я жыву ў сённяшнім часе, і мне хочацца жыць у ім, тут, дзе жывуць мае дзеці, мае ўнукі, дзе я пішу то вершы, то казкі для дзяцей…

Хочацца напісаць: "*…дзе я шчаслівая*" – але, на вялікі жаль, цяпер гэта не так. Розумам ведаю, што шчасце – паняцце адноснае, яно шматаблічнае і вельмі зменлівае… Некалькі месяцаў таму памёр муж, і мне невыносна ад смутку, ад жалю, ад разумення, што ўжо ніколі, ніколі не пабачу яго, не паразмаўляю… Я адчуваю сябе глыбока няшчаснай, але вось прыязджае васьмігадовы ўнук… Ён абдымае мяне, прытульваецца сваім цяплом, я чую, як б'ецца яго сэрца – і мне робіцца так добра, прачынаюцца ўсе пачуцці шчаслівай бабулі… Для яго я не так даўно напісала аповесць-казку "Пра Генія і монстрыка Пстрыка". Магчыма, у будучыні яна стане цікавай кніжкай для дзетак. А ўвогуле, пра будучыню лепш не загадваць. У творчасці ўсё непрадказальна, як і ў жыцці.

◆ *Паняцце Радзімы – толькі паняцце геаграфічнай прасторы або яно ўключае таксама паняцце часу?*

У маладосці хочацца адкрываць для сябе вялікі, шырокі свет… Хочацца наведаць тую ці іншую краіну, а калі жыццё на схіле… Думаеш, што не аднойчы згадвала ў творах Нясвіж, а дагэтуль не змагла хоць бы на некалькі дзён паехаць туды… А Іванава, у наваколлі якога некалі нарадзіўся Напалеон Орда! А тая самая Бяроза, родная вёска Пешкі, дзе нарадзілася я… Моцна вабіць Бацькаўшчына, хочацца туды, паблукаць па тых сцежках, прытуліцца да старой вішні, якую калісьці даўно-даўно пасадзіў мой дзед… Ці не ў гэтым вялікі сэнс жыцця, а можна сказаць – пакуль яшчэ разгорнутай Кнігі, якая называецца жыццём?!.